«ГОД ЗА ГОДАМ — КАРАГОДАМ»



ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 2. Студзень — ... зімы (прык.). **3.** Закупорка для бутэлек. **5.** Колер наступаючага новага 2017 года, які, паводле ўсходнеазіяцкага календара, з'яўляецца годам агнявога, або чырвонага, Пеўня. **8.** «Лезь, каза, на ..., пакажы хамут». З каляднай песні. **9.** Ёсць ..., ды госця няма; няма ні коркі, а госці з горкі (прык.). **10.** Змяя і ...; сумяшчальныя партнёры чырвонага Пеўня. **11.** «І спеў ільецца ўсё мацней, — // Гулянку справіў ... Падвей». З верша М. Багдановіча «Завіруха». **13.** Від пячаці. **15.** «Ёлку везлі нам на ... // Белы зайка і жаўна. // Як прывезлі ёлку ў хату — // Стала ёлачкай яна». З верша С. Сакалова-Воюша «Ёлка». **17.** Лепш ... сёння, чым курыца заўтра (англійская прык.). **19.** ..., рубін, апал; камяні — талісманы 2017 года. **20.** «Куцця. Марозна. Хмурнавата // ... падкідвае заўзята». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля» («Каляды»). **21.** ... і пшано. Зерне, якое павінна прысутнічаць на навагоднім стале, каб улагодзіць чырвонага Пеўня. **23.** Пахвала, адабрэнне. **24.** «І заплача ..., і застогне ..., // Загалосіць зіма белавокая». З верша З. Бядулі «Зімовая казка». **28.** Калі на Раство ..., то ўлетку будзе шмат арэхаў (прыкм.). **29.** «Дзякуй Богу, добры снег ідзе, // Шчодры ... Каляду вядзе». З верша Хв. Жычкі «Шчодры ...». **30.** Дзе куры — ..., там і пеўні малайцы (прык.). **32.** «... за годам — карагодам // І ўжо сёння з Новым годам! // Я сардэчна ад душы // Вас віншую, малышы!» З верша К. Крапівы «З Новым годам!»

ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1. Не пакрылі ... — не пакрыюць і Каляды (прык.). **3.** Сімвал хрысціянскага культу; у трэцюю куццю ... малявалі на сценах, варотах, каб абараніцца ад нячыстай сілы. **4.** Калядная маска; сімвал багацця, дабрабыту. **6.** ... з бубнам; ён заўсёды суправаджаў калядоўшчыкаў. **7.** Дома — певень, а на вуліцы — ... (прык.). **12.** Печаныя вырабы з мукі; іх гаспадыня выпякала на стары Новы год у выглядзе кароў, свіней і авечак. **14.** «Ці ведаеш, дзядзька, // Што дзяціна робіць? // Усе куры парэзала, // Адзін ... ходзіць». (Прыпеўка.) **15.** Хваёвае вечназялёнае дрэва. **16.** Гандлёвая плошча ў старажытнагрэчаскіх гарадах. **18.** У граматыцы словазменная катэгорыя іменных часцін мовы. **22.** «Хай сягоння ў вашай хаце // ... вясёлы загучыць». З верша Я. Золака «З Новым годам!» **25.** ... Шамякін. Імя народнага пісьменніка Беларусі, які нарадзіўся ў год Пеўня. **26.** Непраходныя густыя мясціны. **27.** Чужыя ... спяваюць, а на наш ціпун напаў (прык.). **31.** ... зерне пуды прыносіць (прык.).

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ. *г. Дзяржынск.*

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:

Па гарызанталі: 2. Дах. 3. Корак. 5. Чырвоны. 8. Кут. 9. Кус. 10. Бык. 11. Пан. 13. Штамп. 15. Свята. 17. Яечка. 19. Гранат. 20. Сняжок. 21. Проса. 23. Хвала. 24. Віхор. 28. Вецер. 29. Вечар. 30. Прыгажуні. 32. Год

Па вертыкалі: 1. Пакровы. 3. Крыж. 4. Конь. 6. Музыка. 7. Кураня. 12. Печыва. 14. Пятух. 15. Сасна. 16. Агора. 18. Склон. 22. Смех. 25. Іван. 26. Нетры. 27. Пеўні. 31. Адно.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.28	16.57	7.29
Віцебск —	9.25	16.39	7.14
Магілёў —	9.19	16.47	7.28
Гомель —	9.07	16.52	7.45
Гродна —	9.42	17.14	7.32
Брэст —	9.34	17.23	7.49

Месяц

Маладзік.
Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. Зоі, Марка, Міхаіла.
К. Меланіі, Сільвестра.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



■ Песню бярыце з сабою

А НАСТРОЙ — КАЛЯДНЫ

Напярэдадні Новага года і Каляд прапануем чытачам «Звязды» беларускую народную песню «Ой, калядачкі» ў апрацоўцы Уладзіміра Георгіевіча Мулявіна (1941 — 2003), стваральніка і мастацкага кіраўніка легендарнага ансамбля «Песняры», кампазітара, аранжыроўшчыка, спевака і гітарыста.

Створаная некалькі дзесяцігоддзяў таму, яна і цяпер часта гучыць на канцэртных пляцоўках, у эфіры тэлебачання і радыё ў перыяд навагодніх і калядных дзён.


Ой, ка-ля-дач-кі- блі - ны, ла - дач-кі. Ой, лю-лі, лю-лі блі -
- ны,ла-дач-кі. Ой, лю-лі, лю-лі, блі - ны, ла - дач-кі. Ой, ка-ля - дач-кі,
вы хут-чэй, хут-чэй. Ой, лю-лі лю-лі, вы хут-чэй, хут-чэй. Ой, лю-лі, лю-лі,
вы хут-чэй, хут-чэй. Ка-ля - да, ка-ля да, ка-ля -
-да, ка-ля - да, ка - ля - да!

Шчыра віншуем нашых чытачоў са святамі і жадаем, каб у вашым жыцці заўсёды знаходзілася месца для добрай песні!

ОЙ, КАЛЯДАЧКІ

Ой, калядачкі — бліны, ладачкі.
Ой, люлі, люлі, бліны, ладачкі.
Ой, люлі, люлі, бліны, ладачкі.
Ой, калядачкі, вы хутчэй, хутчэй.
Ой, люлі, люлі, вы хутчэй, хутчэй.
Ой, люлі, люлі, вы хутчэй, хутчэй.
Каляда, каляда, каляда, каляда, каляда!
Напячэм бліноў мы з дражжэй-дражжэй.
Ой, люлі, люлі, мы з дражжэй-дражжэй.
Ой, люлі, люлі, мы з дражжэй-дражжэй.
А калядныя бліны ладныя.
Ой, люлі, люлі, бліны ладныя.
Ой, люлі, люлі, бліны ладныя.
Каляда, каляда, каляда, каляда, каляда!
Мы калядачкам наравіць будзем.
Ой, люлі, люлі, наравіць будзем.
Ой, люлі, люлі, наравіць будзем.
Ой, на ігрышча ды хадзіць будзем.
Ой, люлі, люлі, ды хадзіць будзем.
Ой, люлі, люлі, ды хадзіць будзем.
Каляда, каляда, каляда, каляда, каляда!

Ад рэдакцыі: спадзяёмся, што рубрыка «Песню бярыце з сабою» не пакідае абыякавымі нашых чытачоў. Працуе электронная скрыня pesnya@zviazda.by, куды вы можаце дасылаць свае прапановы пра тое, з гісторыяй якіх песень вы хацелі б пазнаёміцца, якія словы і ноты — пабачыць у рубрыцы. Пішыце нам!

Рубрыку вядзе кампазітар Уладзімір КАРЫЗНА.

УСМІХНЕМСЯ

Муж прынёс дадому невялікую ёлку. Жонка:

— О! І колькі каштуе такі здаровы пучок кропу?

Жанчыны — народ непераборлівы. Ім што Дзед Мароз, што Санта Клаус, што Святы Валянцін — яны ва ўсіх вераць, галоўнае, каб мужык быў добры і з падарункамі.

Пасля сустрэчы Новага года жонка і муж спрачаюцца, каму з іх мыць посуд. Жонка:

— Давай мыць посуд па чарзе! У гэтым годзе твая чарга.

На выязны карпаратыў вялікай кампаніі патрабуюцца нарколаг і траўматолаг.

Раніца, 1 студзеня, абход у бальніцы. Урач уваходзіць у палату, глядзіць у спіс:

— Іваноў тут?

— Я.

— Як прозвішча?

Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

Наступны нумар «Звязды» выйдзе ў аўторак, 3 студзеня 2017 года.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4961.

Нумар падпісаны ў 19.30 30 снежня 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12